# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ РУХУ ВАЛЬДЭНСАЎ

*Валодзіна А. В.*
*(Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт)*

Ерэтычны рух вальдэнсаў узнікае на поўдні Францыі ў 70-ых гг. XII ст. і з цягам часу распаўсюджваецца ад Пірэнеяў да Карпатаў пад самымі рознымі назвамі: вальдэнсы (ад заснавальніка – Вальдо), бедныя з Ліёна або леаністы (родны горад Вальдо) (Pauperes de Lugduno/ Leonisti), рункарыі (Runcarii) (глава італьянскай галіны – Іаан з Ронка), мантанэлі або ўльтрамантаны (Montonelli/Ultramontani) (тыя, хто жыве ў гарах або за гарамі), бедныя духам (Pauperes Spiritu), бедныя ламбардцы (Pauperes Lombardi) і інш. У 1532 г. вальдэнсы афіцыйна далучыліся да пратэстанцкага руху, а ў 1975 г. аб'ядналіся з Італьянскай метадысцкай царквой. У дадзены час вальдэнсы жывуць на Поўначы Італіі (з цэнтрам у П'емонце, горад Торэ Пелічэ (Torre Pellice)), Германіі, ЗША, Аргентыне і Уругваі, з'яўляючыся, такім чынам, адзіным ерэтычным рухам, які здолеў легалізавацца і праіснаваць да нашага часу.

У XIII – XIV стст. у вальдэнсаў існавала адзіная арганізацыя, якая выяўлялася ў наяўнасці агульнага сінода (capitulum generale), на які збіраліся прадстаўнікі ўсіх вальдэнскіх абшчынаў. Кіраваў гэтым сходам часцей за ўсё вальдэнскі «папа» : «*вальдэнсы маюць і паставілі сабе адзінага галоўнага над сабой, якога называюць сваім Найвялікшым (Majoralem), якому ўсе падпарадкоўваюцца, як усе каталікі ў падпарадкаванні Уладару Папе*» [11, с. 248]. Да канца XIV ст. гэтыя сіноды збіраліся ў Ламбардыі, бо тут было больш бяспечна – можна было згубіцца ад пільных вачэй інквізіцыі сярод шматлікіх замежных гандляроў і паломнікаў. У 1231 г. у Аналах горада Марбаха паведамляецца, што нямецкія вальдэнсы кожны год высылалі ў Мілан «аброк» [2, с. 176] – магчыма, цэнтрам з'яўляўся гэты ламбардскі горад. На канец XIV ст. ёсць указанне на «папу» з Апуліі [8, с. 252]. На гэтых прадстаўнічых сходах збіраліся грошы, якія ахвяравалі вернікі, і вызначаліся накірункі вандровак магістраў на наступны год. Назіралася выразная эканамічная няроўнасць розных рэгіёнаў: «*большасць грошай, на якія яны* [французскія вальдэнсы] *жылі, паходзіла з Германіі*» [4, с. 120].

Але, нягледзячы на гэта, вальдэнскі рух не быў аднолькавым па ўсім

арэале свайго рассялення. Безумоўна, існаваў набор прыкметаў, якія дазваляюць адносіць тых ці іншых ерэтыкоў менавіта да вальдэнсаў: прызнанне найвышэйшага аўтарытэту Бібліі, адмаўленне чыстца і карысці малітваў за мёртвых, адмаўленне аўтарытэту рымскага пантыфіка etc. У той жа час у трактоўцы штодзённых абавязкаў сапраўднага хрысціяніна існавалі шматлікія рэгіянальныя асаблівасці. Гэта дало падставу некаторым аўтарам казаць пра існаванне не адзінага «вальдызму», а «вальдызмаў» [3; 14]. Гэтым вальдэнскім асаблівасцям і будзе прысвечаны дадзены артыкул.

## 1.Стаўленне да працы ў розных рэгіёнах.

Найбольш цікавай і неадназначнай асаблівасцю з’яўляецца стаўленне да працы, што адпавядае агульнаеўрапейскай парадыгме стаўлення да жабрацтва. Першапачаткова за працу рукамі выступалі толькі італьянскія вальдэнсы (ламбардцы), што нават паслужыла для іх адной з падставаў аддзялення ад французаў. Так казаў пра гэта Ансельм Александрыйскі «*ламбардцы працуюць, ультрамантаны не працуюць ні на сябе, ні на другіх за грошы, ні гандлююць чым-небудзь, ні служаць*» [12, с. 370]. У ламбардцаў існавалі нават «злучэнні працоўных» [18, с. 24]. У XIII ст. такой жа сістэмы прытрымліваліся і вальдэнсы ў Аўстрыі, пра што сведчыць Пасаўскі Анонім: «*жывуць з працы рук сваіх, як працаўнікі; нават іх дактары – гэта ткачы і шаўц*» [18, с. 73-74]. У Паўночнай Італіі такая асаблівасць можа тлумачыцца, па-першае, уплывам умільятаў [9, с. 109; 6, с. 2], у якіх ерась была моцна звязана з ткацкімі саюзамі, а, па-другое, больш імклівым развіццём мануфактурнай вытворчасці ў гарадах Ламбардыі.

Паступова ў руху вальдэнсаў крышталізуецца іншая дактрына, падобная да каталіцкай царквы: святары – вандроўныя прапаведнікі не працуюць сваімі рукамі, а жывуць з падаянняў вернікаў за навучанне і прыняцце споведзяў. У сваю чаргу вернікі працавалі, нават не зважаючы на выходныя дні – нават па нядзелях (акрамя жыхароў заходнеальпійскага (італьянскага) рэгіёна напрыканцы XIV ст.: «*Працаваць па нядзелях – смяротны грэх, які ніхто не можа адпусціць, акрамя Бога*» [5, с. 395]), за выключэннем Апостальскіх святаў. Гэтая тэндэнцыя ўзнікае, па сведчаннях Стэфана дэ Бурбона, адпачаткова ў Францыі, распаўсюджваючыся потым і на Германію. Вось што сказана на гэты конт у “памежнай” крыніцы – “Пра жыццё і дзейнасць Бедных з Ліёна”: «*Не працуюць, нічога не набываюць і не атрымліваюць прыбытку, на які маглі б выжываць, але на даброты і міласціну сваіх сяброў і вернікаў існуюць і жывуць, шчыра клапоцячыся пра навучанне*» [7]. Такая схема падзелу абшчыны на аселых вернікаў і вандроўных прапаведнікаў будзе характэрна для ўсіх вальдэнскіх групаў

незалежна ад рэгіёна ўжо з XIII ст. Можна меркаваць, што яна была найбольш эфектыўнай: аселыя вернікі/сябры паспяхова імітавалі каталікоў, «*каб не ствараць прэцэдэнта для скандалу*» (Стэфан дэ Бурбон) [12, с. 349-351], сапраўдныя браты ж жылі «*з міласціны, якая ім даецца іх вернікамі і тымі, хто згодныя з іхнымі справамі; не працуюць рукамі пасля таго, як становяцца дасканалымі, ні робяць аніякай справы для заробку, акрамя як, магчыма, для адводу вачэй, каб не быць пазнанымі або схопленымі*» (Бернард Гі) [11, с. 249].

## 2.Прыстасаванне да жыцця ў гарадскім асяроддзі: адмаўленне ад беднасці і забароны клятвы

З першага пункту пра немагчымасць працы лагічна вынікае (і амаль заўжды ўказваецца разам у крыніцах) тэзіс пра немагчымасць валодання маёмасцю для "братоў" «*не будзе багата жыць ад працы рук сваіх, але будзе жыць з міласціны да самай смерці, і вандраваць блізка і далёка, куды ён будзе пасланы, не зважаючы на перашкоды*» [8, с. 367-369].

Але між тым ужо ў сярэдзіне XIV ст. у лісце Іаана Лезера сустракаецца спасылка на валоданне вальдэнсамі амафарамі, срэбрам і золатам [4, с. 216], што ўказвае на ўзрастанне маёмаснага становішча вальдэнсаў. Звяртае на сябе ўвагу і Аўгсбургская справа, дзе вальдэнсы далі хабар у памеры 70 гульдэнаў – даволі значная для таго часу сума [15, с. 63]. Але асабліва яркай з'яўляецца асоба вальдэнса-двараніна Іаана Блюменштайна са Страсбурга, вельмі заможнага і ўплывовага гандляра [17, с. 203; 17, с. 59-60; 16, с. 167; 1]. Нагадаем, што сам Вальдо пачынаў з аналагічнага сацыяльнага становішча, але пасля свайго "звароту" адмовіўся ад ранейшых перакананняў і раздаў сваю маёмасць бедным. Іаан гэтага відавочна не зрабіў.

З вышэйпрыведзеных фактаў можна зрабіць выснову, што з цягам часу вальдэнсы, асабліва тыя, што жылі ў гарадах, адаптаваліся да рэаліяў і адыходзілі ад першапачатковых запаведзяў крайняй беднасці на карысць камфорту і дабрабыту.

Паказальным у гэтым плане з'яўляецца і адсутнасць забароны клятвы (самая тыповая рыса вальдэнсаў) для нямецка-французска-швейцарскага рэгіёну (на той час – Свяшчэннай Рымскай імперыі) (гл.карту), адкуль і паходзяць вышэйадзначаныя прыклады, што пацвярджае ступень інтэграцыі вальдэнсаў у сярэднявечнае феадальнае грамадства, заснаванае на клятве.




Аналагічныя звесткі пра дапушчэнне клятвы ёсць і ў інквізіцыйных матэрылялах з Заходніх Альпаў 1380-ых гг. – другога эканамічна развітага рэгіёну таго часу.

## 3.Ужыванне гвалту

Асуджэнне кровапраліцця прысутнічае ў абсалютнай большасці апісанняў вераванняў вальдэнсаў. Але разам з тым мы маем тры прыклады з розных рэгіёнаў, калі вальдэнсы для самаабароны браліся за зброю – гэта Заходнеальпійскія даліны пачынаючы з 1332 г., Страсбург з сярэдзіны XIV ст. і верхнеаўстрыйскі горад Штэйр у 1393 г.

У 1332 г. інквізітар П’емона і Верхняй Ламбардыі Альберта ды Кастэлярыя (Alberto di Castellario) паведамляе, што ерэтыкоў у далінах Люцэрны [19, с. 16] і Перозы стала столькі, што яны збіраюцца больш чым па пяць соцен за адзін раз. Калі ж ён хацеў арганізаваць там інквізіцыйны вышук, вальдэнсы Ангроны, падазраючы, што іх парафіяльны святар Гульельма выдасць іх інквізіцыі, забілі яго адразу пасля месы на цэнтральнай плошчы горада. Потым яны асадзілі Альберта ў яго замку і вымусілі адмовіцца ад намеру прыслаць інквізітараў у даліну.

У Штэйеры з вандроўным цыстэрцыянскім інквізітарам Пятром Цвікерам супрацоўнічалі свецкія ўлады: кашталян Генрых з Елкінгена і прыхадскі бенедыктынскі святар Фрыдрых, які знайшоў інквізітару прытулак. У знак пратэсту вальдэнсы 8 верасня 1393 г. спалілі гумно

Фрыдрыха (па некаторых звестках, дом разам з жыхарамі), і ў якасці папярэджання вывесілі на варотах галавешку і акрываўлены нож [10, с. 13-15]. Той жа лёс чакаў і яго наступніка.

Ахвярай станавіліся не толькі прыходскія святары, але і былыя паплечнікі-рэнегаты. Звернутыя ў каталіцтва вальдэнскія магістры часта заставаліся на сваім місіянерскім шляху і пачыналі прапаведаваць сярод сваіх былых адзінаверцаў, але часцей за ўсё не мелі поспеху. У Страсбургу вальдэнсы нанялі для іх ліквідацыі трох забойцаў.

Адразу звяртае на сябе ўвагу, што ва ўсіх выпадках гаворка ідзе пра рэгіёны з высокай канцэнтрацыяй вальдэнскага насельніцтва, з чаго можна зрабіць выснову, што ў дадзеным выпадку вальдэнсы адчувалі сябе ўпэўнена і не баяліся за наступствы сваіх дзеянняў. У рэгіёнах, дзе ерэтыкі былі прадстаўлены выключна нямецкімі імігрантамі і знайходзіліся ў меншасці (тэрыторыі сучасных Венгрыі, Польшчы і Чэхіі) і там, дзе інквізіцыйны пераслед быў асабліва жорсткі (Лангедок) няма ніводнага зафіксаванага падобнага выпадку. Гэта служыць падмацаваннем тэзісу, што праявы гвалту сярод вальдэнсаў сустракаюцца толькі ў мясцовасцях з высокім узроўнем інтэграці вальдэнсаў у грамадства.

## Агульныя высновы

З прыведзеных вышэй тэзісаў відавочна, што так званы “класічны” вальдызм з яго адмовай ад працы для братоў, маёмасці, клятвы і кровапраліцця сустракаецца ў чыстым выглядзе толькі на сваёй Радзіме – на поўдні сучаснай Францыі. Ва ўсіх астатніх рэгіёнах мы маем справу з яго мадыфікацыямі, абумоўленымі неабходнасцю прыстасавання да навакольных рэаліяў, інтэграцыі ў гарадскія камуны або абароны свайго жыцця і маёмасці.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Ли. Г. Ч. История инквизиции : в 3 т. [Электронный ресурс] / Г. Ч. Ли. – Москва : Эксмо, 2007 г. – Т. 2 : Инквизиция в различных христианских землях. – 504 с. – Режим доступа : http ://www.e-reading.club/bookreader.php/141261/Li_-_Istoriya_inkvizicii._tom_2.html. – Дата доступа : 06.05.15.
2. Annales Marbacenses / ed. R. Wilmans. – Hannoverae : Impensis Bibliopolii Aulici Hahniani, 1861. – S. 142-180. – (MGH ; SS. 17).
3. Biller, P. Bernard Gui, Peter Zwicker, and the geography of Valdismo or Valdismi / P. Biller // Bollettino della Società di Studi Valdesi. – Torre Pellice : Società di Studi Valdesi, giugno 2007. – F. 200. – P. 31-43.
4. Biller, P. The Liber Electorum / P. Biller // The Waldenses 1170-1530 : Between a Religious Order and a Church. – Aldershot : Ashgate Press, 2001. – P. 207-224.

5. Boffito, G. Eretici in Piemonte al tempo del Gran Scisma (1378-1417) / G. Boffito // Studi e documenti di storia e diritto. – Roma : Tipografiapoliglottadella S. C. di propaganda fide, anno XVIII, 1897. – P. 381-432.
6. Charvaz, A. Origine dei Valdesi e carattere delle primitive loro dottrine / A. Charvaz. – Torino : G. Bocca, 1838. – 512 p.
7. De vita et actibus Pauperes de Lugduno // Bruschi, C. Texts and the Repression of Medieval Heresy // C. Bruschi, P. Biller. – York : Boydell & Brewer Ltd, 2003 – 256 p.
8. Döllinger von, I. Beiträge zur Sektengeschichte des Mittelalters / I. von Döllinger. – München : Wissenschaftliche Buchgesellschaft, 1890. – 737 S.
9. Erbstößer, M. Ketzer im Mittelalter / M. Erbstösser. – Leipzig : ed. Leipzig, 1984. – 235 s.
10. Ghegoiu, S. Waldensians at the turn of the fifteenth century in the Duchy of Austria : Perception of Heresy and Action against Heretics : Master of Arts Thesis in Medieval Studies / S. Ghegoiu. – Budapest : Central European University, 2008. – 51 p.
11. Guidonis, B. Practica inquisitoris haeretica pravitatis / B. Guidonis. – Paris : Alphonse Picard, Libraire-Éditeur, 1886. – 370 p.
12. Heresies of the High Middle Ages. Selected sources translated and annotated / W.L. Wakefield, A.P. Evans. – Columbia University Press : New York and London, 1969. – 865 p.
13. Kieckhefer, R. Repression of Heresy in Medieval Germany / R. Kieckhefer. – Liverpool : Liverpool University Press, 1979. – 161 p.
14. Merlo, G. G. Valdesi e valdismi medievali / G. G. Merlo. – Torino : Claudiana, 1984. – 158 p.
15. Modestin, G. Der Augsburger Waldenserprozess und sein Strassburger Nachspiel (1393-1400) / G. Modestin // Zeitschrift des Historischen Vereins für Schwaben. – 2011. – Vol. 103. – S. 43 – 68.
16. Modestin, G. Ein Mainzer Inquisitor in Strassburg : Ketzerverfolgung und Ordensreform auf dem Lebensweg von Nikolas Böckeler, 1378 – 1400 / G. Modestin // Mainzer Zeitschrift. – 2007. – Vol. 102. – S. 167-173.
17. Modestin, G. Quellen zur Geschichte der Waldenser von Strassburg / G. Modestin. – Hannover : Hahn, 2000. – Vol. 22. – 287 S. – (MGH ; Quellen zur Geistesgeschichte des Mittelalters ; 19).
18. Quellen zur Geschichte der Waldenser / hrsg. von A. Patschkovsky und K.-V. Selge. – Gütersloh : Gütersloher Verlagshaus Gerd Mohn, 1973. – 263 S.
19. Rorengo, M.A. Lettere apologetiche sopra vna risposta, che si andaua sotto mano promulgando, data da vn ministro della pretesa religione all'argumento 12. Che contro loro à. Il molto illustre, e M. reuerendo sig. Marco Aurelio Rorencho de Conti, e priore di Lucerna nella sua historia. Dell'introduttione dell'heresie nelle valli di Piemonte / M.A. Rorengo. – Carmagnola : appresso Gio. Ambrosio Niella, 1634. – 31 p.